3. Ожегов, С.И. Толковый словарь Ожегова онлайн / С.И. Ожегов. – Текст: электронный // Толковый словарь Ожегова: [сайт]. – URL: https://slovarozhegova.ru/ (дата обращения: 13.03.2025).
4. Арапова, Н.С. ЭВФЕМИЗМ / Н.С. Арапова. – Текст: электронный // Большая российская энциклопедия: [сайт]. – URL: https://old.bigenc.ru/linguistics/text/4939390 (дата обращения: 13.03.2025).
5. Матвеева, Т.В. Полный словарь лингвистических терминов / Т.В. Матвеева. – Ростов н/Д: Феникс, 2010. – 562 с.
6. Стариченок, В.Д. Большой лингвистический словарь / В.Д. Стариченок. – Ростов н/Д.: Феникс, 2008. – 811 с.
7. Шишова, Е.В. Определение термина дисфемизм в лингвистических терминологических словарях, справочниках и энциклопедиях / Е.В. Шишова // Филология и культура. – 2014. – № 2(36). – С. 73–79.
8. Иванов, Л.Ю. Культура русской речи: Энциклопедический словарь-справочник / Л.Ю. Иванов, А.П. Сковородников, Е.Н. Ширяев. – М.: Флинта: Наука, 2003. – 840 с.

# АСАБЛІВАСЦІ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ВОБРАЗА ЛЕПЕЛЬСКАГА ЦМОКА Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ І ЛІТАРАТУРЫ

***Вялічка К.Э.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Падстаўленка В.Ф., канд. філал. навук, дацэнт

Як вядома, многія міфалагічныя вобразы ўваходзяць у аксіялагічны фонд беларусаў. Яны здаўна выкарыстоўваліся як у народнай творчасці, так і ў мастацкай літаратуры. Трэба адзначыць, што міфалагічныя вобразы пастулова напаўняліся новымі рысамі і значэннямі. Некаторыя вобразы значна трансфармаваліся, іншыя засталіся блізкімі да архаічных. Не выключэнне і вобраз цмока, які быў прадстаўлены ў розных варыяцыях: цмок-нячысцік, Цуда-юда, Лукомскі цмок, Лепельскі цмок.

Актуальнасць даследавання абумоўленая тым, што ў нашым артыкуле праводзіцца параўнальна-тыпалагічны аналіз вобраза Лепельскага цмока ў беларускім фальклоры і мастацкай літаратуры, вызначаюцца адметнасці міфалагічнага мыслення народа. Мэта даследавання – вызначыць асаблівасці рэпрэзентацыі вобраза Лепельскага цмока ў беларускім фальклоры і літаратуры, устанавіць яго месца ў айчыннай аксіялогіі.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання паслужылі народныя легенды пра Лепельскага цмока [1], раман У. Караткевіча “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” [2] і кніга А. Басака “Беларускія нячысцікі: водныя і балотныя” [3], праца А. Грушэцкага “Лепельскі цмок”. Даследаванне праведзена з арыентацыяй на сістэмны аналіз мастацкіх тэкстаў і з выкарыстаннем элементаў параўнальна-тыпалагічнага метада.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Лепельскі цмок – персанаж шматлікіх народных і мастацкіх твораў. У кожным з іх яго вобраз рэпрэзентуецца па-рознаму, надзяляецца пэўнымі асаблівасцямі, выражае адметнае значэнне.

Напачатку звернемся да вобраза Лепельскага цмока ў фальклорнай традыцыі. Згодна з народнай легендай, гэты міфалагічны персанаж не быў злым, ён, наадварот, выступаў у якасці апекуна шлюбу. Маладыя ахвяравалі яму напоі і ежу, а цмок благаслаўляў іх на сумеснае жыццё. Адзінае, што потым п’яны цмок моцна разыходзіўся, і возера шумела [1]. Такім чынам, цмок у народнай легендзе надзелены станоўчай канатацыяй, што не адпавядае традыцыйнаму казачнаму вобразу цмока, адметнасці якога мы вызначылі ў ранейшых даследаваннях [5].

Тую ж гісторыю апісаў А. Грушэцкі ў сваім лісце “Лепельскі цмок”, дасланым у рэдакцыю дзіцячага часопіса “Вясёлка”. У сваім матэрыяле А. Грушэцкі адзначыў наступнае: “Лепельскі цмок вядомы быў тым, што дапамагаў усім закаханым і ўлюбёным у справах сардэчных і сямейных. Дбаў ён аб тым, каб людзі жылі ў каханні і згодзе, быў заступнікам сямейнага шчасця” [4]. Такім чынам, Лепельскі цмок зноў жа паказваецца пераважна са станоўчага боку.

Лепельскі цмок, апісаны А. Грушэцкім, чыніў і іншыя добрыя справы. Так, ён ратаваў людзей: “А калі нехта з купальшчыкаў не разлічваў свае сілы і пачынаў тануць, цмок, калі праплываў недзе непадалёк, абавязкова выцягваў таго стомленага небараку

на сваёй магутнай спіне на водмель” [4]. Акрамя таго, нават у знешнім выглядзе цмока адзначаюцца рысы станоўчага персанажа: “А вось вочы на дзіва добрыя” [4].

Заўважым, што ў аналізуемым мастацкім тэксце апісваюцца і некаторыя адмоўныя рысы цмока: “Адзінае, каго не любіў, – гэта мясцовых рыбакоў, якія вылоўлівалі рыбу. Цмок лічыў гэту рыбу сваёй і ні з кім сваімі запасамі ежы дзяліцца не жадаў. Таму нярэдка рыбакі бясследна знікалі падчас рыбалкі, а потым дзе-небудзь на беразе возера часам знаходзілі толькі перакушаныя напалову лодкі” [4]. Такім чынам, цмок з-за уласнай нахабнасці шкодзіць рыбаловам, што сведчыць пра некаторую амбівалентнасць вобраза.

На адмоўную канатацыю можа ўказваць і сувязь лепельскага цмока з прыроднымі з’явамі. Так, ён з’яўляецца ў час навальніцы, якая ў айчыннай міфалогіі суадносіцца з нячыстай сілай. Адпаведна цмок з’яўляецца ноччу ў час панавання зла.

Такім чынам, мы выявілі, што вобраз цмока, апісаны А. Грушэцкім, паказваецца асбівалентным. Гэта, як сцвярджае аўтар матэрыяла, і з’яўляецца прычынай усталявання ў Лепелі ў 2013 помнік легендарнаму цмоку.

Але факты з мінулага сведчаць, што з распаўсюджваннем хрысціянства святары пачалі асуджаць такі культ. Пад уплывам гэтага ўспрыманне вобраза лепельскага цмока змянілася, а легенда трансфармавалася. Так, у рамане “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” [2] У. Караткевіч паказаў Лепельскага цмока, засяродзіўшы ўвагу на яго знешнім выглядзе. Аўтар апісаў яго наступным чынам: “Выглядам той цмок быў, як звер фока, такі самы льсняны, у складках толькі без поўсці. І шэры, як фока” [2, с. 11]. Аднак адрозніваў цмока выключна вялікі памер, яго даўжыня складала пятнаццаць метраў. Акрамя таго, цмок меў доўгую шыю, на якой сядзела галава “адначасова падобная і на галаву змяі, і на галаву лані” [2, с. 11]. Пачвара мела вялікія вочы, таму сваім поглядам выклікала ў людзей жах: “І страшна было глядзець у тыя вочы, і мурашкі па спіне, нібы Евінага змія ўбачыў, і непамысна неяк, і нібы ў нечым вінаваты” [2, с. 11].

Такім чынам, пра адмоўную канатацыю вобраза цмока ў творы У. Караткевіча сведчыць яго знешні выгляд. Акрамя таго, пісьменнік адзначыў наступнае: “Якраз у тыя гады выдахлі ў Сенненскіх азёрах цмокі, пра якіх пісаў яшчэ прыпадобны Амбраджэй Куцеянскі; якіх цмокаў ён калісьці закляў і загнаў у возера, каб не палохалі людзей” [2, с. 7]. Прыведзенай вытрымкай з мастацкага тэксту мы можам пацвердзіць, што адмоўную канатацыю вобраз Лепельскага цмока набыў пад уплывам хрысціянства. Тым не менш, пісьменнік не паказаў, што цмок менавіта чыніць зло, таму таксама можна меркаваць пра пэўную амбівалентнасць вобраза.

У кнізе А. Басака “Беларускія нячысцікі: Водныя і балотныя” сярод вялікай колькасці міфалагічных вобразаў прадстаўлены і вобраз Лепельскага цмока. Пісьменнік падаў блізкае апісанне да тых, што ўжо адзначаліся намі, аднак, у адрознінне ад У. Караткевіча, адзначыў яго выключную прыгажосць: “На мой погляд, азёрныя і рачныя цмокі самыя прыгожыя з усіх відаў. Цела – як у звера фокі пакрытае луской, вялізныя плаўнікі і доўгі хвост, на канцы якога перапончатая зорка. Галава нагадвае сумясь лясной лані і змяі” [3, с. 53]. Такое апісанне сведчыць пра станоўчую канатацыю аналізуемага вобраза. Адзначым, што ў фальклорнай традыцыі ўсе станоўчыя персанажы таксама вызначаюцца выключнай прыгажосцю. Акрамя таго, пісьменнік заўважыў, што Лепельскі цмок нічога дрэннага не рабіў.

**Заключэнне.** З нашага даследавання вынікае, што вобраз Лепельскага цмока ў фальклорнай традыцыі падаецца са станоўчай канатацыяй. Міфалагічны персанаж з’яўляецца апекуном сям’і. Адпаведным чынам ўспрымаецца названы вобраз у мастацкай літаратуры, хаця і з элементамі пэўнай амбівалентнасці. Мы вызначылі, што дамінантнай характарыстыкай вобраза Лепельскага цмока варта лічыць яго станоўчы пачатак, які спрыяе папулярызацыі міфалагічнага персанажа.

1. Лепельский цмок. – URL: https://m.vk.com/wall-3695188_1441501 (дата звароту: 03.03.2025). – Тэкст: электронны.
2. Караткевіч, У.С. Хрыстос прызямліўся ў Гародні. Евангелле ад Іуды: раман / У.С. Караткевіч. – Мінск: Папуры, 2021. – 688 с.
3. Басак, А. Беларускія нячысцікі: Водныя і балотныя / А. Басак. – Мінск: Папуры, 2024. – 124 с.
4. Грушэўскі, А. Лепельскі цмок / А. Грушэўскі. – Тэкст: электронны // Вясёлка. – 2016. – № 9. – URL: https://www.veselka.by/?p=9237 (дата звароту: 03.03.2025).
5. Вялічка, К.Э. Вобраз Цмока ў беларускім фальклоры / К.Э. Вялічка – Тэкст: электронны // Рэпазіторый ВДУ імя П.М. Машэрава. – URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/38167 (дата звароту: 05.03.2025). – Электрон. версія арт. з: Молодость. Интеллект. Инициатива: материалы XI Междунар. науч.-практ. конф. студентов и магистрантов, Витебск, 21 апреля 2023 года: в 2 т. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2023. – Т. 1. – С. 276–277.

## ЛЕКСІЧНЫЯ РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АДЗІНКІ СА СТАНОЎЧАЙ КАНАТАЦЫЯЙ, ЯКІЯ СЕМАНТЫЗУЮЦЬ СТАН І ПАВОДЗІНЫ ЧАЛАВЕКА

***Галай К.С.,***
*студэнтка 3 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Семянькова Г.К., канд. філал. навук, дацэнт

Беларуская дыялекталогія валодае значным корпусам лексічных адзінак, якія характарызуюць розныя аспекты стану і паводзін чалавека. Традыцыйна лічыцца, што станоўчыя маральна-духоўныя якасці высока цэняцца народам, а негатыўныя – асуджаюцца, што знаходзіць адлюстраванне ў адпаведных лексічных адзінках. Аналіз лексікі “Рэгіянальнага слоўніка Віцебшчыны” [1; 2] паказаў, што лексічныя адзінкі з адмоўнай канатацыяй, якія апісваюць характар і паводзіны, пераважаюць колькасна. Слоўнік утрымлівае таксама прыклады лексем з адабральнай ацэнкай, хоць і ў меншай колькасці. *Мэта* даследавання – выявіць і сістэматызаваць зафіксаваныя ў “Рэгіянальным слоўніку Віцебшчыны” лексічныя адзінкі са станоўчай канатацыяй, якія характарызуюць стан і паводзіны чалавека, прааналізаваць іх семантыку і ролю. *Актуальнасць* працы бачыцца ў тым, што апісанне такіх лексем дазваляе выявіць, якія каштоўнасці цэняцца ў дадзеным рэгіёне і як яны адлюстраваны ў мове. Улічваючы, што ў дыялектнай мове часцей сустракаюцца адзінкі з адмоўнай канатацыяй, вывучэнне станоўчай лексікі дапамагае лепш зразумець адметнасць светаўспрымання жыхароў Віцебшчыны.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання паслужылі лексічныя рэгіянальныя адзінкі са станоўчай канатацыяй, якія семантызуюць стан і паводзіны чалавека, зафіксаваныя ў “Рэгіянальным слоўніку Віцебшчыны”. Выкарыстаны метады назірання і апісання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Падчас працы з “Рэгіянальным слоўнікам Віцебшчыны” быў выяўлены шэраг лексічных адзінак з выражанай станоўчай канатацыяй, якія апісваюць розныя аспекты стану і паводзін чалавека. Для зручнасці далейшага аналізу лексемы былі раскласіфікаваны на наступныя тэматычныя групы:

1. Інтэлектуальныя здольнасці і красамоўства. У названую групу ўваходзяць адзінкі, якія падкрэсліваюць кемлівасць, розум, дасведчанасць індывіда. Напрыклад, ***лаба́ты.*** ‘разумны’: *Глянь, які лаба́ты, усё знаіць* (Казімірова Пол.) [1, с. 276]; ***мазгава́тый*** ‘кемлівы, разумны’: *Унук у міне маладзец: мазгава́тый расцець* (Лужасна Віц.) [2, с. 14].

Семантыка лексем засяроджвае ўвагу на высокім узроўні інтэлектуальнага развіцця, здольнасці хутка і эфектыўна знаходзіць рашэнні, што, безумоўна, ацэньваецца станоўча ў беларускай лінгвакультуры. Да гэтай групы можна аднесці таксама дзеяслоў ***заліва́цца*** ‘прыгожа гаварыць, вызначацца красамоўствам’: *Гаворыць яна – аж залі́ваецца, толькі слухай* (Порплішча Докш.) [1, с. 201], які падкрэслівае валоданне дарам слова, што традыцыйна лічылася важнай якасцю і дазваляла чалавеку дасягаць поспеху ў грамадстве.